# РОЛЯ СВЯТ У ЖЫЦЦІ МОЛАДЗІ: АНАЛІЗ АРГАНІЗАЦЫІ СВЯТОЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РАБОЦЕ ЎСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ

**Шык К.І.**
*магістр педагагічных навук, выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

У нашай краіне святочная культура займае важнае месца ў жыцці кожнага грамадзяніна. Моладзь, якая з'яўляецца адной з прагрэсіўных частак насельніцтва, прымае актыўны ўдзел у шматлікіх святах як у якасці ўдзельнікаў, так і гледачоў. На працягу стагоддзяў беларусы стваралі разнастайныя формы абрадаў і свят, якія адлюстроўвалі розныя бакі грамадскага жыцця. Святы заўсёды з'яўляліся неад'емнай часткай беларускага народа, бо немагчыма ўявіць сабе нашу краіну без святочнай культуры, якая на працягу стагоддзяў захоўвала, назапашвала, перадавала і ўзбагачала агульную культуру Беларусі.

Можна сказаць, што свята – гэта выяўленне і замацаванне гістарычных ведаў народа, якія ўвасоблены сродкамі мастацтва, а таксама спосаб адпачынку людзей ад будзённых спраў, дзе могуць выяўляцца арганізатарскія, творчыя, духоўныя, камунікатыўныя і іншыя здольнасці чалавека. Свята – гэта дзейсная сістэма, накіраваная на навучанне, развіццё і выхаванне чалавека [1, с. 14].

Усе святы ўмоўна можна падзяліць на некалькі груп. Першая група – гэта каляндарныя святы, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на цыклы, якія адпавядаюць порам года: зімовыя, веснавыя, летнія і восеньскія святы. Другая група – гэта хрысціянскія святы, якія падзяляюцца на праваслаўныя, каталіцкія, уніяцкія, пратэстанцкія і інш. Трэцяя група – гэта дзяржаўныя святы, якія ўсталёўваюцца ў азнаменаванне падзей, якія маюць вялікае гістарычнае ці грамадска-палітычнае значэнне для краіны і аказваюць уплыў на развіццё грамадства: Дзень незалежнасці, Дзень перамогі, Дзень герба і сцяга і інш. Чацвёртая группа–прафесійныя святы, якія створаны для ўшанавання значнасці асобных прафесій: дзень работнікаў культуры, дзень настаўніка, дзень мытніка і інш. Пятую групу складаюць новыя святочныя формаўтварэнні, у гэту групу – новыя святы, якія запатрабаваны сучаснасцю (свята інтэрнэта, свята лесу, свята мёду і г.д.).

Асаблівай папулярнасцю сярод жыхароў нашай краіны карыстаюцца народныя святы, такія як Каляды, Масленіца, Вялікдзень, Купалле, Дажынкі, якія ўжо даўно ператварыліся з местачковых, сакральных у вялікія маштабныя святочныя дзеі, якія адзначаюцца на дзяржаўным узроўні. Асобнае месца ў народных святах займае кірмаш як яскравае гульнёва-гандлёвае свята, у якім спалучаюцца амаль усе віды мастацтва.

Шырокае распаўсюджанне атрымалі шматлікія фестывалі рэгіянальнага, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, такія як “Славянскі базар” (г. Віцебск), “Сожскі карагод” (г. Гомель), “Музычная восень” (г. Мінск), “Залаты шлягер” (г. Магілёў), “Звіняць цымбалы і гармонік”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(г. Паставы), Фестываль феерверачнага мастацтва “Навальніца” (г. Лагойск) і іншыя, шырокавядомыя ў нас і за мяжой.

Час не стаіць на месцы, і ў выніку плённай працы дзеячаў культуры і мастацтва з’явіліся новыя ўнікальныя святочныя формаўтварэнні: Свята беларускага пісьменства, Дзень незалежнасці, Свята нацыянальных культур Беларусі (г. Гродна), Усебеларускае свята народнага гумару ў Аўцюках, Свята беларускай мовы, святы народных рамёстваў, фестывалі ў гонар юбілеяў выдатных дзеячаў беларускай літаратуры, культуры і мастацтва і інш. Улічваючы рэлігійную шматканфесійнасць нашай краіны, у святочнай культуры яскрава замацаваліся і хрысціянскія містэрыі, і шматлікія духоўныя святы. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца святы гарадоў і вёсак, спартыўныя, святы на вадзе і інш.

Такім чынам, можна сказаць, што з цягам часу ў працэсе гістарычнага развіцця ўзнікла шмат новых святочных формаўтварэнняў, якія могуць адбывацца як у маштабах горада, раёна, вуліцы, пасёлка і г.д, так і ладзіцца ўстановамі культуры. Адзначым той факт, што ўстановы культуры – гэта бібліятэкі, клубы, музеі, тэатры, школы мастацтваў, паркі і іншыя падобныя арганізацыі. Аднак трэба звярнуць увагу на тое, што ўстановы клубнага тыпу – гэта шматфункцыянальныя, комплексныя ўстановы культуры, якія займаюць цэнтральнае месца ў нашым аналізе арганізацыі святочнай дзейнасці, якая ўваходзіць у іх прамыя абавязкі. Калі бібліятэкі выкарыстоўваюць кніжную прадукцыю, музеі – метад нагляднага паказу, установы мастацтваў эмацыйна ўздзейнічаюць на гледача, выкарыстоўваючы мастацкія вобразы, то клубныя ўстановы шырока прымяняюць у сваёй працы ўвесь комплекс форм і метадаў уздзеяння на людзей. З клубамі цесна супрацоўнічаюць і бібліятэкі, і тэатры, і філармоніі, і музеі і іншыя ўстановы. Да клубных устаноў адносяцца і маленькія клубы, і вялікія Палацы і Дамы культуры.

Установы культуры праводзяць святы рознай накіраванасці, што абумоўлена сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве. З упэўненасцю можна сказаць, што сёння ў арганізацыі святочнай дзейнасці клубных устаноў аднаўляецца гістарычная пераемнасць народнай культуры на глебе рэгіянальных традыцый. Арганізатары сацыяльна-культурнай дзейнасці, рэжысёры, педагогі непасрэдна абапіраюцца на ўсё карыснае, што ёсць ў актыве народных традыцый. Ва ўстановах культуры праводзяцца ўсе асноўныя святы каляндарнага цыклу. З мэтай шырокай прапаганды захавання і развіцця сямейных народных традыцый ладзяцца шматлікія фестывалі, конкурсы, высілкамі ўстаноў культуры адбываецца ўцягванне дзяцей і моладзі ў сферу традыцыйнай культуры, народнай творчасці, падтрымліваюцца фальклорныя рухі. Традыцыйнымі для клубных устаноў з’яўляюцца ваенна-патрыятычныя фестывалі і конкурсы, мерапрыемствы, прысвечаныя памяці вайны ў Афганістане, перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне і інш. Асаблівае месца ў дзейансці клубных устаноў займаюць мясцовыя фестывалі мастацкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самадзейнасці, гульнёвых праграм, эстраднага вакальнага і харэаграфічнага мастацтава і інш.

Варта адзначыць і той факт, што ўстановы культуры вельмі цесна працуюць з моладдзю, якая з’яўляецца іх “актывам” і дапамагае ў арганізацыі і правядзенні шматлікіх мерапрыемстваў, у той ці іншай форме. Напрыклад моладзь дапамагае клубным работнікам у выпуску сценгазет, складанні альбомаў, падрыхтоўкі выстаў, канцэртаў. Пры стварэнні свята, работнікі ўстановы культуры могуць знайсці кожнаму справу па яго інтарэсах.

Адной з пераваг святочнай дзейнасці клубных устаноў, з'яўляецца іх патэнцыйная максімальная даступнасць для самых розных груп насельніцтва, у тым ліку і моладзі, незалежна ад матэрыяльнага і сацыяльнага становішча, адукацыйнага ўзроўня, здольнасцяў і г.д.

Адзначым, што святочная дзейнасць – гэта шматгранны творчы працэс і вынік працы рэжысёраў, культарганізатараў, педагогаў і іншых творчых асобаў, накіраваны на дасягненне пэўных выхаваўчых, эстэтычных, маральных, адпачынкавых і іншых мэтаў, якія ўвасоблены арганізатарамі ў форме ўрачыстасці альбо сукупнасці звычаяў, абрадава-рытуальных, відовішчных ці масава-гульнёвых дзей, у якіх могуць спалучацца ўсе віды і жанры мастацтва [1, с. 15].

Эфектыўнасць святочнай дзейнасці, якую праводзяць клубныя ўстановы можна выявіць на аснове аналізу актыўнага ўдзелу клубных наведвальнікаў у прапанаваных клубных мерапрыемствах не толькі ў ролі гледачоў і слухачоў, але і ў якасці саўдзельнікаў і выканаўцаў. Неабходна адзначыць, што пакуль пры арганізацыі святочнай дзейнасці ў клубных установах гэтая магчымасць рэалізуецца недастаткова. Гэта звязана з тым, што ў саміх сцэнарыях і рэжысуры гэтых мерапрыемстваў пераважае схема ўздзеяння, але не ўзаемадзеяння ўдзельнікаў адзін з адным, з выканаўцамі, арганізатарамі.

Варта адзначыць, што святы, якія ладзяць клубныя ўстановы, не заўсёды вырашаюць пэўныя задачы патрыятычнага выхавання моладзі, бо ў цяперашні час, нягледзячы на існаванне пры клубах аматарскіх аб’яднанняў, фальклорных рухаў, правядзення свят календарнага цыклу і інш., адбываецца засілле нізкапробных узораў масавай культуры і выцясненне з сістэмы масавага культурнага абслугоўвання якасных узораў айчыннай і замежнай культуры, што з'яўляецца адным з чыннікаў маральнай дэградацыі, страце ўласнай культурнай ідэнтычнасці, прымітывізацыі сацыяльных і культурных запытаў шматлікіх старшакласнікаў і грамадства. Адна з пераваг клубных устаноў у рашэнні задачы патрыятычнага выхавання моладзі складаецца ў якаснай святочнай дзейнасці як альтэрнатывы пасіўнаму ўспрыманню імі прымітыўных відовішчаў і забаваў.

Аналіз работы клубных устаноў і патэнцыйныя магчымасці святочнай дзейнасці дазваляюць вылучыць яе наступныя крытэрыі: забеспячэнне даступнасці клубнай актыўнасці культуратворчай скіраванасці для моладзі; актуальнасць і даступнасць сацыяльна значнай культурна-пазнавальнай інфармацыі для моладзі сродкамі святочнай дзейнасці; інавацыйнасць святочнай дзейнасці, якая спрыяе фарміраванню патрыятызму; развіццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуратворчай актыўнасці моладзі ў працэсе арганізацыі святочнай дзейнасці.

Даследаванні паказалі, што неабходна пераасэнсаванне святочнай дзейнасці ў рэальнай практыцы работы клубных устаноў. Цэнтруючы сваю ўвагу пераважна на канцэртах, дыскатэках, камерцыйных святах, работнікі культуры значна звужаюць выхаваўчы патэнцыял клубных устаноў і святочнай дзейнасці. Адпаведна патэнцыйна клубныя ўстановы з'яўляюцца інавацыйнымі і эксперыментальнымі пляцоўкамі для самых розных формаў і тэхналогій рэжысёрскага мастацтва, што таксама з'яўляецца складаючай часткай іх выхаваўчага патэнцыялу.

Праблема фарміравання і рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу клубных устаноў залежыць ад больш поўнага і якаснага выкарыстання святочнай дзейнасці ў выхаваўчым працэсе. Рэалізацыя педагагічнага патэнцыялу святочнай дзейнасці не павінна насіць чыста фармальны характар. Колькасны рост святаў нельга разглядаць як перадумову якасных змен у развіцці асобы навучэнца, бо гэта залежыць ад якасці стварэння свят, якая і вызначае змяненне магчымасцяў педагагічнага патэнцыялу і характар яго рэалізацыі.

Аналіз паказвае, што недастатковая ўвага да выяўлення педагагічнага патэнцыялу святочнай дзейнасці сведчыць, першым чынам, аб наяўнасці рэзкага спаду развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры і іх забеспячэння спецыялістамі.

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што нягледзячы на вялікую колькасць святочных мерапрыемстваў, якія робяцца ўстановамі культуры, нельга сказаць аб іх якаснай рэалізацыі і высокім педагагічным патэнцыяле. Гэта можна патлумачыць тым, што дзейнасць устаноў культуры па развіцці ўзроўню патрыятызму моладзі, не заўсёды адпавядае запатрабаванням, інтарэсам, дадзенай узроставай катэгорыі і патрабаванням часу.

Не ўсе святы спрыяюць патрыятычнаму выхаванню, педагогамі і рэжысёрамі клубных устаноў не заўсёды выкарыстоўваюцца вялізарныя выхаваўчыя магчымасці святочнай дзейнасці.

Эфектыўнасць дзейнасці ўстаноў культуры ў патрыятычным выхаванні моладзі ў працэсе святочнай дзейнасці патрабуе ўключэння яе ўдзельнікаў у актыўную творчую дзейнасць, арыентацыю на духоўныя каштоўнасці і іх узнаўленне, на захаванне нацыянальнай культуры, беларускай мовы, што не заўсёды адбываецца.

---

1. *Шык К. І.* Выкарыстанне святочнай дзейнасці ў выхаванні навучэнцаў ва ўстановах клубнага тыпу / К.І. Шык // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2012. – № 7. – С. 13–16.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ